# Традыцыі сямейнай абраднасці Гомельска-Бранскага памежжа (на матэрыяле фальклору Гомельскага раёна)

В.С. Новак

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

Гомель, Беларусь

Сямейныя абрады і звычаі Гомельска-Бранскага памежжа выяўляюць па сваёй структуры і характары выканання рытуалаў генетычную роднаснасць і тыпалагічнае падабенства. Асаблівую цікавасць уяўляюць запісаныя на тэрыторыі Гомельскага раёна фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы па радзінна-хрэсьбіннай і вясельнай абраднасці. Канкрэтныя ўмовы бытавання напаўняюць іх адметнымі рысамі.

Спачатку засяродзім увагу на мясцовых асаблівасцях вясельнай абраднасці названай мясцовасці. Адзначым, што структура вясельнага абраду ў вёсках гэтага аднаго з памежных раёнаў уключае кампаненты давясельнай, уласнавясельнай і паслявясельнай частак.

Варта адзначыць, што абавязковым этапам давясельнага перыяду ў вёсках Гомельскага раёна з’яўлялася сватанне, падчас якога адбываўся рытуальны дыялог паміж бацькамі нявесты і сватамі. У некаторых вёсках (напрыклад, Задораўка, Калініна) сватанне, запоіны і заручыны адбываліся, як адзначылі інфарматары, адначасова: “У нас запоіны, сваты і заручыны было адно і тое ж, усё было ўмесці” (запісана ў в. Калініна ад Хамяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г. н.).

У в. Аздзеліна, калі ўжо сватанне адбылося, то маладая абавязкова выконвала адметны рытуал – “дзелала рукапажацці і цалавала сватоў” (запісана ад Трышчанковай Домны Мітрафанаўны, 1921 г. н.). Затым яна перавязвала ручнікамі свёкра і іншых сватоў, што сімвалізавала згоду на шлюб. У в. Макаўе сімвалам згоды дзяўчыны на шлюб з’яўляўся разрэзаны ёй хлеб, прынесены сватамі: “Калі дзеўка была згодна, то яна разразала хлеб папалам” (запісана ад Сяргейчык Марыі Мікалаеўны, 1936 г. н.).

Калі дзяўчына не была згодна выходзіць замуж, то, напрыклад, у в. Калініна, яна павінна была вынесці гарбуз і пакласці на парог: “Ну, еслі, напрымер, дзеўка не хоча за гэтага хлопца замуж ісці, так яна – гарбузу. Яны як сталі на парог. Дак яна возьме гарбузу. Поўную гарбузу, абыкнавенную” (запісана ад Філонавай Ганны Фёдараўны).

Адметнай дэталлю ў сватанні на тэрыторыі Гомельскага р-на з’яўляўся рытуал выкупу “пеўня”, якога рыхтуюць спецыяльна, шыюць із ленты такога, прышываюць, а тады ўжо закрыюць насавіком і выкупляюць, іхнія ўжэ сваты кідаюць грошы дзеўкам: “От колькі там ужэ захадзіла, ну, таргуюцца, тады ўжэ кінуць яны, надзяюць маладому на галаву ета, свяцілка абрывае етага пеўня” (запісана ў в. Грабаўка ад Каменка Маргарыты Міхайлаўны, 1944 г. н.).

Аналагічны рытуал з “пеўнем” падчас сватання адбываўся і ў в. Маркавічы: “… ужо “пятуха” бяруць пад паху, і дзеўкі гавораць: “Вот і купляйце ўжо петуха”. Ну, і купляюць” (запісана ад Юрасёвай Анастасіі Яфімаўны, 1922 г. н.).

У в. Пракопаўка сватанне называлася магарычом: “Як выходзіць дзеўка замуж, прыходзяць піць магарыч увечары… Бацька, матка прыходзяць мужыковы і п’юць магарыч, сватаюць маладую” (запісана ад Мядзведзевай Любові Акімаўны, 1933 г. н.).

Зборная субота ў вёсках Гомельскага раёна мела назву “завіванне ёлачкі”: “Увечары таго ж дня завівалі ёлачку. Падругі нявесціны вілі яе. Вешалі цвяты і другое што-нібудзь на ёлачку, украшалі яе, адным словам. Калі вілі ёлачку, то песні пелі… Калі свілі ёлачку, то яна аставалася ў хаце нявесты. Абязацельна, штоб ета ўсё дзелалі ў нявесцінай хаце” (запісана ў в. Калініна ад Хамяковай Анастасіі Васільеўны, 1927 г. н.).

Паводле сведчанняў жыхаркі в. Рудня Марымонава, перасяленкі з в. Халочча Чачэрскага р-на, рытуал выкупу маладой адбываецца менавіта ў становішчы пад ёлкай, пры гэтым дзяўчаты імкнуліся як мага хутчэй сесці на гэтае месца, дзе была маладая, каб “тожа пайсці замуж. Пад ёлкай садзілі толькі тую, якую вязлі к вянцу” (запісана ад Драбышэўскай Соф’і Трыфанаўны, 1939 г. н.).

У в. Урыцкае таксама рыхтавалі “ёлку” (“У лесе вырубілі ёлку, цвятоў, надзелалі і цвятамі наражаюць”) і ў хаце жаніха, і ў хаце нявесты: “Малада і падружкі ставяць ёлку на стале, забіваюць яе ў калодку крэпка, каб яна стаяла, а тады ўжо збіраюцца каля стала і спяваюць песні маладой, пакуль жаніх прыедзе” (запісана ад Нядолі Марыі Паўлаўны, 1947 г. н.). Пры гэтым дзяўчаты стараліся хутчэй схапіць і адламаць вярхушку ёлкі: “Хто атламае, той быстрэй замуж выйдзе” (запісана ад Нядолі Марыі Паўлаўны, 1947 г. н.).

Важнымі момантамі ў комплексе вясельнай абраднасці з’яўляюцца падрыхтоўка і дзяльба каравая. Апошні абрадавы этап адбываўся ў хаце маладой, дзе абавязкова павінны былі паставіць пасярод стала ёлку, якой напрыканцы (“раздаўшы каравай”) “ламалі і білі маладых, што былі здаровымі, прыткімі ў рабоце і не былі лянцяямі” (запісана ў в. Аздзеліна ад Грышчанковай Домны Мітрафанаўны, 1921 г. н.).

Паслявясельную частку ў вёсках Гомельскага раёна называлі па-рознаму: “*вадзіць пярэзвы*” (“Як дзень, сабіраецца к нявесце, а тады назаўтра – к жаніху” (в. Бальшавік)), “*пята*” (“А калі ўжо паследніх гасцей угасцілі, ідуць к дзеўцы, ловяць курыцу, скубуць, вараць. Называецца гэта пята”) (в. Брылёва), “*драць курыцу*” (“На другі дзень свадзьбы дралі курыцу. Пераадзяюцца ўсе, ідуць па сялу, дзе курыцу паймалі, галаву адкруцілі ёй… Бяруць палку длінную такую, за ногі звяжуць, галаву скруцяць, павесяць…”), “*на гарэлыя пірагі*” (“Чэраз нядзелю после свадзьбы едуць, напрымер, я сына свайго жаніла, сваха прыгласіла, прыязжайце на “гарэлыя пірагі”) (в. Глыбоцкае), “*цыгане*” (“У нас казалі – цыгане ходзяць: “Хавайце куры. Бо ўжо цыгане ходзяць”) (в. Даўгалессе), “к*урыца*” і “*пярэзвы*” (“Патом нявесціны госці едуць да жаніха. Гуляюць там. На другі дзень ловяць курыцу. Яе смаляць і вараць з яе суп. На трэці дзень збіраюцца і ходзяць у пярэзвы”) (в. Задараўка), “*банкеты*” (“Калі два дні пагулялі, то пасля цэлую нядзелю вадзілі бяседу. Гэта калі хто-небудзь з жаніховай і нявесцінай радні шчэ гуляць хацелі, то дзелалі банкет”) (в. Калініна), “*разгрэбіны*” (“На разгрэбіны гуляюць у гульні. Пяюць песні, танцуюць. Сваты гасцей запрашаюць у хату, за стол з пачастункамі і гарэлкай. З ліку гасцей выбіраюць жаніха і нявесту. Дзяўчына пераапранаецца ў

мужчыну, а мужчына – наадварот”) (в. Рудня-Марымонава), “*атводзіны*” (“Прыехалі к маткі. Матка зноў пасадзіла за стол. Яны прыйшлі, як кажуць, у атводзіны. Гулялі, танцавалі. Скублі ды варылі суп з курацiны. Раскладалі агонь і смалілі курыцу, і скакалі чэраз агонь”) (в. Сямёнаўка) і інш.

Кожны з этапаў вясельнай абраднасці ў вёсках Гомельскага раёна вылучаецца адметнымі рытуаламі, разнастайнымі па тэматыцы і ў жанравых адносінах песнямі, багатай сістэмай міфалагічных уяўленняў, адлюстраваных у прыкметах пі павер'ях.

Радзінна-хрэсьбінныя абрады і звычаі Гомельскага раёна адрозніваюцца адметнымі мясцовымі асаблівасцямі, аднак захоўваюць агульнабеларускую аснову. Засяродзім увагу на тых забаронах і традыцыйных правілах, якіх павінна была прытрымлівацца цяжарная жанчына, бо, лічылася, што дзякуючы гэтаму можна паспрыяць нараджэнню здаровага дзіцяці. Даследчык А. С. Фядосік прапанаваў вылучыць некалькі груп забарон для цяжарнай жанчыны, звязаных з засцярогай нованароджанага: “1. Забарона дзеянняў, якія могуць пашкодзіць знешняму выгляду дзіцяці, выклікаць хваробу. 2. Засцярогі, накіраваныя супраць негатыўных паводзін дзіцяці ў будучым. 3. Забарона дзеянняў, ад якіх залежыць лёс нованароджанага (няшчасце, беднае эканамічнае становішча і інш.)” [Фядосік, 1997, с. 20].

Што датычыць першай групы забарон, звязаных са знешнім выглядам дзіцяці, то адзначым наступныя. Напрыклад, паводле сведчанняў жыхароў в. Рудня-Марымонава, забаранялася цяжарнай жанчыне, калі здараецца ў вёсцы пажар, “хватацца рукамі за цела сваё… Ежэлі яна ўхвоціцца ці за шчаку, то тагда дзіцёнак народзіцца, і ў яго пятно на ўсё ліцо будзе краснае” (запісана ад Драбышэўскай Соф'і Трыфанаўны, 1939 г.н.). Нельга было, зыходзячы з народных уяўленняў, цяжарнай жанчыне дакранацца і да жывёлы, калі спалохаецца, бо “ў дзіцяці вырасце густое валоссе” (запісана ў в. Церуха ад Казіміравай Кацярыны Ксенафонтаўны, 1918 г.н.). Каб не сурочыць дзіця, цяжарная жанчына павінна была насіць фартух: “Трэба было насіць фартук, штоб не быў дзіцёнак урочаны (не баяўся ўроку)” (запісана ў в. Брылёва ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.). “Фартух акрэслівае і замацоўвае мяжу паміж бачным і нябачным светамі, узаемадачыненні якіх рэгуляваліся колам абярэгам” [Беларуская міфалогія, 2006, с. 522-523].

Да ліку засцярог, якія маглі прадухіліць негатыўныя паводзіны дзіцяці ў будучым, можна аднесці наступныя: “Нельга было красці, каб дзеці не былі злодзеямі” (запісана ў в. Брылёва ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.). У в. Церуха, калі хацелі дазнацца пра пол нованароджанага, то задавалі цяжарнай жанчыне нечаканае пытанне: “Чаму рукі гразныя?” – І назіралі за яе дзеяннямі: “Тая спалохана працягвала рукі і глядзела. Калі ладонямі ўверх працягвала рукі, то будзе дзяўчынка, а калі ўніз – то хлопчык” (запісана ад Казіміравай Кацярыны Ксенафонтаўны, 1918 г.н.).

Важнымі персанажамі хрэсьбінных святкаванняў з’яўляюцца бабка-павітуха, кум і кума. Бабка-павітуха выконвала вельмі адказную ролю як напярэдадні святкавання хрэсьбін, так і ў час іх правядзення. Асноўныя функцыі яе – купанне дзіцяці і падрыхтоўка абрадавай стравы – кашы, гаршчок з якой абавязкова павінны былі разбіць. Магічнае значэнне надавалі чарапкам ад разбітага кумам гаршка з кашай: “Чарапкі бралі, грызлі зубамі, каб зубы не балелі, свінням у сарай кідалі, штоб свінні вяліся. І калі не было дзяцей доўга, то бярэш кусочак ад гаршка і кладзеш на макушку, і прыгаворвалі” (запісана ў в. Брылёва ад Гарбузавай Марыі Яўсееўны, 1929 г.н.).

Аналагічныя дзеянні з чарапкамі ад гаршка выконвалі і ў іншых вёсках Гомельскага раёна, напрыклад, у в. Даўгалессе “етыя чарапкі… бяруць і, у кого дзяцей мало, на галаву кладуць” (запісана ад Антоненка Вольгі Мінічны, 1927 г.н.). Жыхары в. Макаўе (перасяленцы з Брагінскага раёна) гэтыя чарапкі клалі “незамужнім” на галаву, каб нарадзілі дзіця (запісана ад Маісеенка Праскоўі Рыгораўны, 1920 г.н.), а таксама выкарыстоўвалі іх як засцярогу ад маланкі, грому: “Гліняныя чарапкі бралі дамой і клалі на акно. Верылі, што гэта засцярога ад грома” (запісана ад Маісеенка Праскоўі Рыгораўны, 1920 г.н.). У іншых мясцовасцях Гомельскага р-на чарапкі ад разбітага гаршка госці забіралі дахаты, бо верылі, што тады “ў доме будуць шчасце і дзеці” (запісана ў в. Яроміна ад Салаўёвай Зінаіды Пятроўны, 1936 г.н.).

Прыведзены матэрыял з’яўляецца яскравым пацвярджэннем багацця лакальных асаблівасцей сямейнай абраднасці аднаго з памежных раёнаў Гомельска-Бранска-Чарнігаўскага рэгіёна.

Дадзены артыкул падрыхтаваны ў межах выканання сумеснага навуковага праекта БРФФД – РГНФ “Формирование и функционирование традиционной культуры на территории русско-белорусского пограничья: межкультурное взаимодействие в диахронии и синхронии” (2010 – 2012 гг.).

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд; дап. – Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.

2. Фядосік, А.С. Беларуская сямейна-абрадавая паэзія / А.С. Фядосік / Навук. рэд. А.С. Ліс. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 1997. – 126 с.